УДК 633.14 : 631.53(476)

М. Ф. СВІРЫДАЎ, Н. Г. СІДАРЭВІЧ, В. І. КАРАНЕЎСКІ,
Т. М. КРЫЛОВА, Л. Д. ПАЎЛАВА

ЗАЛЕЖНАСЦЬ НАСЕННАЙ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ АЗІМАГА ЖЫТА ПУХАЎЧАНКА АД АГРАТЭХНІЧНЫХ УМОЎ ВЫРОШЧВАННЯ

Адным са шляхоў павелічэння ўраджайнасці і валавых збораў зерня з'яўляецца хуткае (за 3—4 гады) правядзенне сортазмены, што непасрэдна залежыць ад памераў пасяўных плошчаў, занятых новым сортам, а таксама ад узроўню ўраджайнасці насенных і насенняводчых пасеваў. Сельскагаспадарчай вытворчасці ўжо сёння патрэбны такія тэхналогіі вырошчвання насення, якія забяспечвалі б атрыманне 35 і больш цэнтнераў высакаякаснага насення з 1 га. Пры гэтым вельмі важна, каб такое насенне мела высокія ўраджайныя якасці. Неабходнасць у падобных даследаваннях выклікана таксама раяніраваннем у Беларускай ССР шэрага новых сартоў зерневых культур інтэнсіўнага тыпу, у тым ліку азімага жыта Пухаўчанка.

Для вырашэння пастаўленай задачы былі закладзены палявыя доследы па вывучэнні ўплыву нормаў высеву, фонаў азотнага жыўлення і сродкаў аховы пасеваў ад хвароб на выхад насення, яго пасяўныя якасці і ўраджайнасць. Даследаванні праводзілі на эксперыментальнай базе «Жодзіна». Глеба доследнай дзялянкі дзярнова-падзолістая лёгкасуглінкавая, падсцілаецца пяском. Агрохімічная характарыстыка ворнага гарызонта наступная: колькасць рухомых формаў P_2O_5 — 18,2—20,0, абменнага калію — 14,0—17,4 мг/100 г глебы, гумусу — 2,1 %, pH_{KCl} 5,2—5,6.

Апрацоўка глебы рэкамендаваная для дадзенай зоны. Папярэднік — ячмень, які ідзе пасля кармавых буракоў, пад якія ўносілі 60 т/га гною. Дозы ўгнаенняў пад азімае жыта: $P_{70}K_{110}$ — пад культывацыю, N_{60-90} — вясной у падкормку ў пачатку вегетацыі раслін і частка, згодна са схемай доследу, у фазу трубкавання.

Папярэднікам азімага жыта ў доследзе па вывучэнні ўраджайных уласцівасцей насення была гароха-аўсяная сумесь на зялёную масу. Фосфарна-калійныя ўгнаенні ($P_{60}K_{120}$) уносілі пад культывацыю, азотныя ў форме аміячнай салетры па 60 кг/га д. р. — вясной у падкормку.

На ўсіх доследах праводзілі комплекс мерапрыемстваў па ахове раслін ад хвароб, пустазелля і палягання. Насенне перад пасевам апрацоўвалі фундазолам (2 кг/т). Вясной у фазе кушчэння праводзілі хімічную праполку пасеваў дыяленам (2,5 кг/га) або 2М-4ХП (4 л/га). У фазе трубкавання расліны апырсквалі кампазанам М (3,5 л/га), а ў доследзе, які праводзіўся па інтэнсіўнай тэхналогіі, дадаткова выкарыстоўвалі цілт (0,5 л/га) у пачатку каласавання. Паўторнасць чатырохразовая.